**УСТАРЭЛАЯ ЛЕКСІКА ЯК ЭТНАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ КАМПАНЕНТ У НАВУЧАННІ МОВЕ**

***Халадок В.М.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік*** *– Н.А. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт*

Сучасная моўная адукацыя малодшых школьнікаў, акрамя іншых, ставіць задачу асэнсавання беларускай мовы як нацыянальна-культурнай каштоўнасці, а значыць, назапашвання вучнямі лінгвакультурных уяўленняў. Такі падыход прадугледжвае выхаванне культурнай асобы ў працэсе набыцця лінгва- і этнакультуралагічнай інфармацыі пры чытанні тэкстаў адпаведнага зместу і вылучэння ў іх краіназнаўчай інфармацыі, засваення слоў і выразаў. На думку метадыстаў, беларускую мову неабходна вывучаць з мэтай пазнаць свой народ у яго тэрытарыяльнай, гістарычнай і сацыяльнай акрэсленасці [1, с. 3].

Лінгвістычная навука XXI стагоддзя актыўна распрацоўвае накірунак, у якім мова разглядаецца як “культурны код нацыі”, а не толькі сродак камунікацыі і пазнання рэчаіснасці [2, с. 2]. Мова – гэта шлях пранікнення не толькі ў сучасную ментальнасць нацыі, а яшчэ і шлях спасціжэння гістарычнага мінулага. Дакрануцца да мінулых эпох магчыма не толькі чытаючы падручнікі, гісторыя адлюстравана ў сімвалах старажытнай культуры, фальклорнай спадчыне, у мастацкіх і публіцыстычных творах гістарычнай тэматыкі. Таму ўключэнне этнакультуралагічнага кампанента ў курс беларускай мовы будзе спрыяць і паспяховаму засваенню моўнага матэрыялу, і фарміраванню асобы сучаснага школьніка як нацыянальна свядомай.

Адной з крыніц этнакультуралагічнага кампанента можна лічыць устарэлую лексіку, якая ўваходзіць у мастацкія творы для дзяцей. Названы пласт лексікі спецыяльна не вывучаецца ў пачатковай школе. Аднак гістарычна афарбаваны моўны матэрыял можа быць выкарыстаны пры вывучэнні ўсіх раздзелаў мовы, пры выпрацоўцы ўмення працаваць са слоўнікамі, на ўроках літаратурнага чытання (напрыклад, метад гістарычнага каментарыя). Вычляненне ўстарэлай лексікі з тэкстаў гістарычнага характару і выкарыстанне яе для стварэння ўласных будзе спрыяць як засваенню гісторыі народа, так і ўдасканаленню культуры маўлення малодшых школьнікаў.

**Літаратура**

1. Буракова, М.У. Беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя / М.У. Буракова, В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава: пад. рэд. В.А. Ляшчынскай; М-ва адукац. РБ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 237 с.

2. Маслова, В.А. Лингвокультурология : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / В.А. Маслова. – М. : Издательский центр «Академия», 2001. – 208 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина